ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ ВОБРАЗА ВІТАЎТА Ў ТВОРАХ БЕЛАРУСКАЙ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

А. М. Рагілевіч

Студэнтка,
Беларускі дзяржаўны педагагічны
ўніверсітэт імя Максіма Танка,
г. Мінск, Беларусь

Summary. This article observes the connonim Vitovt in A. Dudarov's artistic work “Prince Vitovt”. Determined, additional, individual author's meanings are analyzed that acquire a connotonim with the national and cultural component, indicate the role of the context of various types in the realization of such onms.
Keywords: vitaut; connotonim; national and cultural component.

Пачынаючы з XX ст., у беларускай літаратуры актыўна з’яўляюцца мастацкія творы, прысвечаныя пэўным гістарычным падзеям ці асобам. У гэтым напрамку пачалі пісаць А. Петрашкевіч (“Скарынін сын з Полацка”, “Напісанае застаецца” і “Русь Кіеўская”), У. Караткевіч (“Каласы пад сярпом тваім”, “Сівая легенда”, “Зброя”, “Нельга забыць”), А. Куляшоў (“Хамуціус”), Т. Бондар (“Рагнеда”), У. Арлоў (“Ефрасіння Полацкая”), А. Дудараў (“Палачанка”, “Крыж”, “Князь Вітаўт”), К. Тарасаў (“Тры жыцці княгіні Рагнеды”, “Пагоня на Грунвальд”) і інш.

У дадзеным артыкуле на матэрыяле гістарычных твораў – драмы А. Дударава “Князь Вітаўт” і рамана К. Тарасава “Пагоня на Грунвальд” – паспрабуем раскрыць канатацыйныя значэнні канатоніма ***Вітаўт*** у мастацкім кантэксце.

Мінула ўжо больш за 600 гадоў з таго часу, як беларускай дзяржавай пачаў кіраваць князь Вітаўт. Гэта гістарычная асоба з’яўляецца адной з ключавых фігур у пантэоне герояў “беларускага ВКЛ” [3, с. 93].

Вітаўт – князь гарадзенскі, вялікі князь літоўскі, таленавіты дзяржаўны дзеяч і палкаводзец ВКЛ, адзін з самых славутых і магутных кіраўнікоў за ўсю нашу гісторыю. У новую беларускую мастацкую літаратуру вобраз Вітаўта ўвайшоў дзякуючы твору К. Тарасава “Пагоня на Грунвальд”.

Раман прысвечаны гераічнаму змаганню нашых продкаў з агрэсіяй Тэўтонскага ордэна, і ўжо ў гэтым творы гісторыя паказана на шырокім фоне: жыццё ліцвінаў, паляк, у прыватнасці жыццё Вітаўта і Ягайлы; бітвы з крыжакамі; панарамнае апісанне Грунвальдскай бітвы [2, с. 2].

У раздзеле “Тлумачэнні” бачым наступны артыкул: *'Вітаўт-Аляксандр (1350-1430) – вялікі князь літоўскі з 1392 года, сын Кейстута*'. Гэта яшчэ раз сведчыць, што аснова рамана – гісторыя!

Прааналізуем канатацыйныя значэнні, якія набывае канатонім Вітаўт у рамане “Пагоня на Грунвальд”. Так, аўтар шырока выкарыстоўвае сему

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

'*князь*', раскрываючы яе праз ужыванне эпітэтаў ***вялікі*** (*Апоўдні першага снежня* ***вялікі князь Вітаўт*** *на чацвёртай вярсце Люблінскага шляху сустракаў караля Уладзіслава Ягайлу;* ***Вялікі князь*** *Аляксандр-Вітаўт!; …і Аляксандр, ці Вітаўт,* ***вялікі князь Літоўскі, зямель Рускіх пан і дзедзіч****…*), ***гарадзенскі*** (*Ціхі быў у маладыя гады* ***гарадзенскі князь Вітаўт****…*), ***суровы*** (***Суровы князь Вітаўт****, думаў Андрэй*), ***падкаленны*** (*А Вітаўт – ягоны [Скіргайла]* ***князь падкаленны****…*). У мастацкім творы сустракаюцца і шматлікія эмацыянальна-афарбаваныя сінонімы: ***валадар, збавіцель айчыны*** (*Так багі вырашалі – Вялікае Княства Вітаўту, ён –* ***валадар, збавіцель айчыны****…*), ***намеснік у Вільні*** (*Князь Кейстут пакінуў* ***намеснікам у Вільні*** *яго, Вітаўта*), ***кароль*** (*Па сутнасці, вы і ёсць* ***кароль****; застаецца назваць рэчы сваімі сапраўднымі імёнамі; …****кароль сарацынаў Вітаўт*** *імкнецца пашырыць сарацынскае царства…; Слава Вітаўту –* ***каралю Літвы і Русі****!*), ***дваюрадны брат*** *(…ні* ***дваюрадны брат Вітаўт*** *– не смелі пальцам крануць, а свалаччо баярскае – у нас павінны поўзаць, за шчасце прымаць калі нагой пнуць!*), ***Альгердавічы*** (*Браты павінны былі сядзець зараз тут, Альгердавічы*). У рамане ёсць і метафарычныя семы, такія, як ***арол*** (*…а вялікі князь* ***арлом*** *лунае над Княствам, усё бачыць…*) і ***воўк*** (*Ён і Ягайла самі былі як* ***ваўкі*** *– маладыя, дужыя, у аўчынах паверх кальчух…; Ягайла і Вітаўт з'ехаліся на ловы ў Берасце* ***<…> Ваўкі*** *збіваюцца ў зграю; Адчайныя намаганні Ягайлы і Вітаўта, думаў фон Юнгінген лішні раз сведчаць пра абмежаванасць іхняга язычніцкага розуму.* ***Старым ваўкам*** *адмаўляе чуццё…*).

Паспрабуем прасачыць, як літаратурны онім нарошчвае дадатковыя станоўчыя значэнні, на прыкладзе ўжывання вобраза-сімвала ***арол.*** У Тлумачальным слоўніку беларускай мовы гэта лексема мае пераноснае значэнне *'чалавек мужнай прыгажосці, адважны, удалы, смелы'* [4, с. 84]. Звернем увагу і на тое, што вобраз ваўка не аднолькавы на працягу ўсяго аповеду: ва ўспамінах Вітаўта ваўкі маладыя, дужыя, а напярэдадні Грунвальдскай бітвы – старыя і вопытныя.

Вобраз Вітаўта з'яўляецца стрыжнёвым кампанентам драмы А. Дударавы "Князь Вітаўт". Перш за ўсё гэты твор адрозніваецца ад папярэдняга вершаванай формай. Па другое, у драме спалучаюцца два планы: рэалістычны і фантастычны.

Як і ў рамане К. Тарасава "Пагоня на Грунвальд", у драме А. Дударава шырока выкарыстоўваецца сема *'князь'* у спалучэнні з прыметнікамі ***вялікі*** (*Вітаўт —* ***Вялікі князь Літоўскі****; І ты скажы: "Я* ***князь вялікі Вітаўт****", // І загадай вароты адчыніць; Зірні: тут* ***князь, вялікі Вітаўт)****,* ***малады*** (*Але... Вялікі князь... ну як жа тут быць побач, калі на Купалле...* ***малады князь****... трошкі... адышоўся* [Зварот да Кейстута]). Таксама дастаткова пашырана клічная форма *'княжа'* ў спалучэнні з эпітэтамі ***бедны*** (*Бедны, бедны княжа*), ***набожны*** і ***строгі*** (*Набожны, строгі і жанок баіцца*), ***мілы*** і ***любы*** (*Мой* ***любы, мілы***

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***княжа**...; Спіць, мой **любы княжа**; Вітаю з ранкам светлым, **любы княжа!**).* І толькі аднойчы сустракаецца сема *'міралюбца'*: *Як **міралюбца**, ты паўсюль вядомы, // Народ адчыніць замак прад табой… .*

Так, у драме А. Дударава "Князь Вітаўт" вобраз князя з'яўляецца ключавым у адрозненне ад рамана К. Тарасава, дзе галоўнае – змаганне з Тэўтонскім ордэнам і непасрэдна сама Грунвальдская бітва. Калі ў першым творы Вітаўт – рамантычны, высакародны, залішне даверлівы, далікатны для палітыка, не жадае праліваць братэрскую кроў, імкнецца вырашаць мірам усе спрэчкі з Ягайлам, то ў "Пагоні на Грунвальд" вобраз Вітаўта больш рэальны: гэта таленавіты дзяржаўны дзеяч, які адрозніваецца дастатковай суровасцю, хітрасцю, а таксама смеласцю, адвагай і мудрасцю. Але як і ў папярэднім творы, ён імкнецца ўсё вырашаць мірам.

Аналіз названых твораў мастацкай літаратуры паказвае, што канатонім **Вітаўт** побач з традыцыйнымі сэнсамі *'вялікі князь (Літоўскі), гарадзенскі князь, дзяржаўны дзеяч, палкаводзец ВКЛ, Альгердавіч'* пачынае развіваць дадатковыя, канатацыйныя семы *'валадар, збавіцель айчыны, кароль сарацынаў, кароль Літвы і Русі, намеснік у Вільні, зямель Рускіх пан і дзедзіч, міралюбца'* і вобразна-метафарычныя канатацыі *'арол, воўк'*.

Такім чынам, можна сцвярджаць, што ў беларускай культуры, гісторыі і літаратуры канатонім Вітаўт функцыянуе як згорнуты нацыянальна-культурны макратэкст.

Бібліяграфічны спіс

1. Дудараў, А. А. Князь Вітаўт : п'есы / А. А. Дудараў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2006. – 318 с.
2. Пагоня на Грунвальд / Кастусь Тарасаў. – Мінск : Папуры, 2015. – 384 с.
3. Мікульскі, Ю. М. Князь Вітаўт вачыма нашых продкаў / Ю. М. Мікульскі // Беларуская думка. – 2012. – №5. – С. 93–99.
4. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы : больш за 65000 слоў / уклад. : І. Л. Капылоў [і інш.] ; пад рэд. І. Л. Капылова. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2016. – 968 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ